# Марцінята Павел Аляксандравіч



Нарадзіўся ў 1915 годзе на Расоншчыне ў в.Рудня. Пасля заканчэння сямігодкі яшчэ да вайны Павел Аляксандравіч пайшоў настаўнічаць у мясцовай школе. Тут жа завочна паступае ў Магілёўскі педагагічны інстытут. Неўзабаве становіцца дырэктарам сямігодкі.

Вялікая Айчынная вайна не дала магчымасці папрацаваць. Настаўнік прайшоў нялёгкі баявы шлях у складзе партызанскай брыгады імя Сталіна, якая дыслацыравалася на Расоншчыне. Школай для Паўла Аляксандравіча сталі расонскія лясы, а ўказкай – аўтамат.

Калі адгрымела вайна і савецкі народ пачаў загойваць нанесеныя ворагам раны, П.А.Марцінята разам з тымі, хто не раз глядзеў у вочы смерці і атрымаў нарэшце права на мірную працу, цалкам аддаецца школе.

У 1945 годзе яго накіроўваюць настаўнічаць на Міёршчыну. Ужо немалады загадчык Міёрскага райана ў паношаным вайсковым шынялі запрасіў яго прысесці, затым сказаў: “У Пераброддзі няма школы, няма дырэктара. Дырэктарам будзеце Вы. Веру, што там хутка будзе і школа…”

І ён не памыліўся.

Аднак жыццё не стаіць на месцы. Яго хуткабежная плынь кідае людзей у розных кірунках. Захапіла яна і Паўла Аляксандравіча.

З той пары мінула шмат гадоў. Па стану здароўя П.А.Марцінята перадаў пасаду дырэктара маладому калегу, а сам выкладаў родную мову.

Пражытыя гады – прыклад шчырасці і адданасці любімай справе. Данінай вялікай павагі і ўдзячнасці за выхаванне маладога пакалення з’явілася прысваенне ў 1968 годзе Паўлу Аляксандравічу Марціняту высокага звання «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР».

Паўла Аляксандравіча заўсёды вызначалі добрыя і ўважлівыя адносіны да людзей, шчырасць і прастата ва ўзаемаадносінах. Свае веды, любоў да роднай мовы, краю ён умеў перадаць вучням. Вопытам сваёй педагагічнай працы заўсёды дзяліўся з калегамі.

5 лістапада 2001 года на восемдзесят сёмым годзе жыцця яго сэрца перастала біцца.